http://edoc.bseu.by

# ПРАГРЭСІЎНЫЯ ІДЭІ ДЛЯ ГРАМАДЗЯНСКАГА І ЭКАЛАГІЧНАГА ПРАВА Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ МЫСЛЯРОЎ XVI – XVII стст.

Е. Ю. Рогацень

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Грамадзянскае і экалагічнае права з'яўляюцца важнымі галінамі права, паколькі пытанні прававога забеспячэння ўмоў розных здзелак або ахова навакольнага асяроддзя былі актуальнымі заўсёды, толькі па-іншаму былі сфармуляваны і не надаваліся масавой агалосцы. Зараз, калі нормы грамадзянскага і экалагічнага правоў урэгуляваны на заканадаўчым ўзроўні і адлюстраваны ў нарматыўных прававых актах, можна правесці паралель з тым часам, калі ідэі дадзенага прававого напрамку можна было ўбачыць толькі ў творах і на аснове гэтага параўнання зрабіць пэўныя высновы.

Актуальнасць дадзенай тэмы абумоўлена, перш за ўсё, неабходнасцю і магчымасцю ў рамках тэмы прааналізаваць сучаснае беларускае грамадзянскае і экалагічнае заканадаўства, адзначыць у сучасных нормах правава «ноткі» мінулага, якія прасочваюцца ў працах нашых суайчыннікаў, і на аснове прававого аналізу адзначыць магчымы прагрэс сучаснага права, а таксама відавочныя недахопы.

Прафесійная прававая творчасць нашых суайчыннікаў зараджаецца ў другой палове XV ст., у час, калі адносіны паміж дзяржавай і грамадствам пераходзяць на новы ўзровень. Менавіта тады ў гісторыю права Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) ўвайшлі вельмі таленавітыя асобы, якія не толькі заклалі падмурак нашай сучаснай прававой сістэмы, але і склалі прававыя прагнозы, па сутнасці прадказаўшы многія дзеючыя і да гэтага часу прававыя нормы.

Міхалон Літвін (1460 – 1560) – беларускі мысляр і гуманіст, адзін з найбольш яскравых прадстаўнікоў эпохі Рэнесансу ў ВКЛ. Літвіна асабліва моцна турбавалі прабелы ў судаводстве, праблемы падаткаў, непрафесіяналізм і карыслівасць службовых асоб. Свае думкі аб палітыцы, дзяржаве і праве ён развіў у лацінамоўным творы «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян» (1550 г.). Так, шмат яго думак сёння мы сустракаем ў дзеючым заканадаўстве Рэспублікі Беларусь: у Грамадзянскім Кодэксе Рэспублікі Беларусь № 218-З ад 7.12.1998 г. (далей – ГК), Грамадзянскім працэсуальным кодэксе Рэспублікі Беларусь № 238-З ад 11.01.1999 г. (далей – ГПК), Кодэксе аб судовым ладзе і статусе суддзяў № 139-З ад 29.06.2006 г.

Мысляр звяртае ўвагу на прынцыпы правасуддзя: *«Нашы ж вырашаюць справы і асобна, і п'янствуючы, выгнаўшы пасрэднікаў і сведак, і могуць рабіць што захочуць»* [1, с. 206]. Тут аўтар раскрывае прынцып галоснасці судовага разбору і бачыць неабходнасць ў адкрытасці судовага працэсу, каб можна было пераканацца ў тым, што суддзя дзейнічае ў рамках закону. На дадзены момант

гэты прынцып дзейнічае ў ГПК: так, у адпаведнасці з арт. 17, разгляд грамадзянскіх спраў ва ўсіх судах адкрыты.

Далей Літвін фармулюе прынцып незалежнасці суддзяў і падпарадкавання іх толькі закону: *«І хай нават шчыры пазоўнік, выйграўшы справу, задаволіцца пакорлівымі словамі адказчыка, але не суддзя, бо ён заўсёды грабе грошы, з аднаго – штрафныя, з іншага – дзесяцінныя. // Ён бярэ дзесяціну і за зацвяржэнне здзелак і дамоваў. // Таксама і з чалавека ён атрымлівае столькі ж грошаў, мяркуючы, што гэта ўзнагароджанне законна»* [1, с. 205]. Такім чынам, аўтар лічыў, што лёгка «падкупіць» суддзю, і таму неабходна, каб на заканадаўчым узроўні такая практыка забаранялася. На дадзены момант, беларускае заканадаўства прадугледжвае падобную норму: у адпаведнасці з арт. 11 ГПК, пры ажыццяўленні правасуддзя па грамадзянскіх справах суддзі незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону, умяшальніцтва ў іх дзейнасць па ажыццяўленню правасуддзя не дапускаецца і цягне адказнасць па законе.

Далей М. Літвін звяртае ўвагу на саму кваліфікацыю суддзяў і тое, як яны ў цэлым прыйшлі да гэтай пасады: «*Бо яно ў ніх не мірскае, а святое і адпраўляецца яно святарамі кадзіямі, якія прысвячаюцца ў гэта святое званне асобаю прысягаю, прычым з многіх абіраюцца менш абцяжараныя безбожнымі справамі, за якія будуць судзімы іншыя»* [1, с. 192]. Тут мысляр крытыкуе некаторых асоб, якія займаюць пасаду суддзі, бо ў той час былі выпадкі, калі яе маглі займаць, напрыклад, біскупы, а аўтар жадаў бы бачыць у якасці суддзі высокакваліфікаванага спецыяліста. У Рэспубліцы Беларусь гэта пытанне рэгулюецца Кодэксам Аб судовым ладзе і статусе суддзяў, які прадугледжвае адпаведныя патрабаванні да гэтай пасады. Так, у адпаведнасці з ч. 1 арт. 78, кваліфікацыйны экзамен на пасаду суддзі праводзіцца ў мэтах ацэнкі ўзроўню прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў асоб, якія прэтэндуюць на занятак пасады суддзі, іх дзелавых і маральна-псіхалагічных якасцяў. Таксама ў адпаведнасці з ч. 2 гэтага ж артыкула, да кваліфікацыйнага экзамену на пасаду суддзі можа быць дапушчаны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю з прысваеннеі кваліфікацыі «юрыст» або «юрыст з веданнем эканомікі».

Значны ўнёсак у даследуемы прадмет зрабіў ураджэнец Віцебшчыны Адам Алізароўскі (1618 – 1659) – прафесар кананічнага і цывільнага права юрыдычнага факультэта Віленскай езуіцкай акадэміі. Паколькі ён сам выкладаў цывільнае права, то разумеў сутнасць гэтай дысцыпліны і бачыў праблемы яе прымянення ў грамадстве. Свае думкі ён выклаў ў творы «Аб палітычнай супольнасці людзей», які складаецца з уводзін і трох кніг: «Дом», «Грамадства», «Дзяржава».

Так, аўтар звяртае ўвагу на тое, што дагаворы па выкананні living рознай работы паміж бакамі заключаюцца не на ўмовах роўнасці, бо тагачасныя наймальнікі прымушалі сваіх падданых выконваць любую працу без іх згоды: *«У адпаведнасці з гэтай дэфініцыяй вядома перш за ўсё, што не можа існаваць грамадскага пагаднення там, дзе няма ўзаемнай згоды заключаючых кантракт. Згода гэта з'яўляецца неабходнасцю як ва ўсіх справах і пагадненнях, так і ў*

*грамадскіх пагадненнях, якія не толькo ўзнікаюць, але і трымаюцца дзякуючы двухбаковай згодзе яго заключаючых»* [2, с. 269].

Алізароўскі лічыць, што ў аснову дагавора, перш за ўсё, павінна быць пакладзена жаданне абодвух ўдзельнікаў грамадзянска-прававаых адносін, а таксама ўсе ўдзельнікі павінны выконваць свае абавязкі: першы павінен зрабіць добра сваю справу, а другі – даць за гэта грошы. Зараз гэтыя абавязкі рэгулююца нормамі грамадзянскага права і ў адпаведнасці з п. 1 арт. 656 ГК, па дагавору падрада адзін бок (падрадчык) абавязваецца выканаць па заданні іншага боку (заказчыка) пэўную працу і здаць яе вынік заказчыку ва ўстаноўлены час, а заказчык абавязваецца прыняць вынік працы і аплаціць яго.

На думку Алізароўскага, сацыяльны аспект праяўляецца праз развіццё і ўдасканаленне сацыяльнай арганізацыі жыцця людзей: сям'ю, фальварак, паселішча, грамадства, дзяржаву, а біялагічны – праз агульнасць з жывёльным светам. Таксама зыходнымі перадумовамі ён лічыў прыроду і розум. Дадзеныя сцвярджэнні падкрэсліваюць ідэі абароны навакольнага асяроддзя, якія зараз рэгулююцца нормамі Закона Рэспублікі Беларусь аб ахове навакольнага асяроддзя № 1982-XII ад 26.12.1992 г. (далей – Закон аб ахове навакольнага асяроддзя) [3, с. 77].

Ідэі аховы прыроды можна таксама разглядзець у творчасці беларускага гуманіста Міколы Гусоўскага (1470 – 1533). У сваёй знакамітай паэме «Песня пра зубра» ён звяртаецца да Дзевы Марыі з малітвай аб захаванні прыгажосці багацця навакольнага Свету:

*«Вартая ты не малітвы раба, а харалу*
*Цэлага свету знямога – людзей і стварэнняў, –*
*І велічання, і славы ты варта таксама»* [4].

Паэт ставіць чалавека і ўвесь жывы свет на адзін прыступак светабудовы. Бо калі жывёлы, птушкі і іншыя жывыя істоты згінуць, то збяднелы свет скіне ў цемру душу чалавека, і тады не дапамогуць яму ні адукацыя, ні культура. Дадзеныя думкі знайшлі сваё месца ў Законе аб ахове навакольнага асяроддзя. Так, у адпаведнасці з арт. 12 грамадзяне павінны выконваць заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя, павышаць экалагічную культуру, берагчы і ахоўваць прыроднае асяроддзе і рацыянальна выкарыстоўваць прыродныя рэсурсы, выконваць правілы палявання і рыбалоўства і іншыя абавязкі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі адмысловымі заканадаўчымі актамі.

Падводзячы вынік, можна зрабіць наступныя высновы:

Па-першае, нормы сучаснага заканадаўства, перш чым пачаць дзейнічаць у тым выглядзе, у якім сёння мы іх можам бачыць, прайшлі вельмы складаны і доўгі шлях станаўлення, які пачаў фармавацца нават не ў мінулым стагоддзі, а значна раней. Так, тэарэтычныя асновы сучаснага грамадзянскага і экалагічнага права пачалі выяўляцца ў XVI–XVII стст., што сведчыць аб імкненні нашых суайчыннікаў адкрываць новыя магчымасці і выгады для грамадства, якія б забяспечвалі, напрыклад, выкананне сваіх абавязкаў бакамі дамовы і якія б таксама клапаціліся аб навакольным асяроддзі.

Па-другое, выразы і тэрміны, выкарастаныя ў працах Літвіна, Алізароўскага і Гусоўскага, сведчаць аб высокім узроўні тагачаснай адукацыі. Напрыклад, калі мы маем на ўвазе Алізароўскага, то, магчыма, можна падкрэсліць добры выкладчыцкі састаў юрыдычнага факультэта Віленскай езуіцкай акадэміі. Можна меркаваць і пра добрыя навуковыя і практычныя вынікі яго вучняў, якія, мабыць, ў далейшым таксама паўплывалі на ўзровень заканадаўства ў Рэчы Паспалітай.

Па-трэцяе, важна падкрэсліць, што сучаснае заканадаўства, нягледзячы на сваю дакладнасць, не з’яўляецца ідэальным. Аб гэтым сведчыць існаванне тых нормаў, якія з’яўляліся актуальнымі і для далёкага мінулага, і для сучаснасці. Паколькі яны дзейнічаюць, то людзі па-ранейшаму схільны да парушэння нормаў права. Адпаведна, неабходна працаваць над сучаснымі нормамі права ў тым напрамку, каб яны станавіліся яшчэ больш дзейснымі, а таксама неабходна памятаць пра той час, калі дадзеныя прававыя ідэі толькі пачалі з’яўляцца і пра тых, хто з’яўляўся іх стваральнікамі. І толькі тады, калі будзе шанавацца мінулае і ўдасканальвацца сучаснасць, нас будзе чакаць нешта лепшае як у юрыспрудэнцыі, так і ў іншых сферах.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Литвин, М. О нравах татар, литовцев и москвитян десять фрагментов, содержащих различные истории / Михалон Литвин // Белорусские мыслители XVI–XVII вв. Избранные труды. – Минск : Редакция журнала «Промышленно-торговое право», 2017. – С. 184–262.

2. Олизаровский, А. О политической общности людей / А. Олизаровский // Белорусские мыслители XVI–XVII вв. Избранные труды. – Минск : Редакция журнала «Промышленно-торговое право», 2017. – С. 266–281.

3. Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : дапаможнік для студэнтаў найвышэйшых навучальных устаноў / І. У. Вішнеўская. – Мінск : Тэсей, 2004.–272 с.

4. Гусоўскі, М. Песьня пра зубра [Электронны рэсурс] / М. Гусоўскі // Беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: https://library.by/portalus/modules/belpoetry/readme.php?subaction=showfull&id=1141775262&archive=&start_from=&ucat. – Дата доступу: 07.12.2022.